Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 28 г.Магілёва”

# Музейныя заняткі.
# Тэатральная пастаноўка
# “Па ручніку, што з роднай хаты, мы пазнаём цябе Радзіма”

Астранкова Валянціна Цімафееўна, кіраўнік этнаграфічнага музея “Спадчына”, настаўнік беларускай мовы і літаратуры

# Сцэнарый “Бабулін ручнік”

Удзельнікі:
Бабуля
Унук Іванка
Унучка Аленка
Сяброўкі Аленкі

(*За сталом сядзяць бабуля з унукам, бабуля вышывае, унук разглядае кніжку.)*

**Бабуля:** Ой , унучак. Нешта нашай Аленкі няма, абяцала ж прыехаць. Я і піражкоў напякла, і сырнічкаў.

**Унук Іванка:** Можа, бабуля, ёй не цікава ўжо ў нас, у вёсцы. Там жа , у горадзе, і кіно,і дыскатэка, і тэатр. А ў нас што: тэлевізар, камп’ютар ды кніжкі – і ўсё.

**Бабуля:** Не, Іванка, не можа быць, з сяброўкамі абяцала завітаць, казала, што нейкая пільная справа да мяне ў яе ёсць.

**Бабуля:** *(Стук у дзверы.)* А вось і яны, дарэмна, ты Іванка, злаваўся.

*( Заходзяць дзяўчынкі.)*

**Дзяўчаты:** Добры дзень. Ці чакалі вы нас да сябе ў госці?

**Бабуля:** Добры дзень, госцейкі, дарагія. Бачыць вас ў нашай хаце мы заўсёды рады.

**Унук:** Чакалі, ледзь дачакаліся, ужо і прагаладаліся.

*( Дзяўчаты смяюцца. )*

**Унучка Аленка**: А табе, Іванка, як таму кату: хто пра што , а ён пра сала.

( *Дзяўчаты спяваюць першы куплет песні “ Ручнікі”, словы В. Вярбы, музыка М. Пятрэнкі.)*

**Бабуля**: Ах, весялухі, праходзьце хутчэй, мясціцеся, дзе каму зручней.

**Дзяўчынка 1:** А мы , бабуленька, невыпадкова з гэтай песні пачынаем размову. Аленка нам казала,што ў вашым доме шмат цудоўна расшытых ручнікоў з ільну, а ведаем мы пра іх не вельмі многа. Можа, дапаможаце нам?

**Бабуля:** Ах, хітрухі. Ну, слухайце ды частуйцеся пірагамі, што пад гэтым ручнічком ляжаць. А ручнічок гэты называецца “абыдзеннік”, такім



ручніком карысталіся нашы продкі кожны дзень: пакрывалі хлеб пасля выпечкі, беражліва загортвалі хлеб і ежу, калі ішлі ў дарогу ці ў поле на працу.

Да абыдзеннікаў адносіцца і “ручнік- ўціральнік” , які прызначаўся для выцірання рук і твару. Яго не аздаблялі ні ўзорамі, ні вышыўкай. *(Дзеці разглядаюць ручнікі.)*

**Бабуля.** А як вы думаеце, дзеткі, які ручнік быў самым галоўным і значным ў хаце?

**Іванка:** Ой, бабуля, гэта павінны ведаць усе. Гэта ж “ набожнік”, яшчэ яго называлі “багавік” ,”набожны платок”, ручнік, які пакрывае святыя абразы: Багародзіцы, Ісуса Хрыста, святых заступнікаў сям”і. Яго расшывалі багатым



арнаментам, поўным глыбокага сімвалізму. Выціраць рукі такім ручніком – вялікі грэх.
**Бабуля:** Раней існаваў спецыяльны платок-ручнік, якім павязвала галаву замужняя жанчына,а называўся ён – ”намітка”. *(Бабуля паказвае працейшы спосаб павязвання “наміткі”.)*
- А у наш час дзе вы часцей за ўсё бачыце расшыты ручнік?
**Дзяўчынка 2**: На вяселлі. Я бачыла, як маладых сустракалі на вышытым ручніку з хлебам-соллю. На ручніку маладым падносяць хлеб-соль, на прыгожым ручніку красуецца каравай, ручнікамі абвязваюць сватоў, ручніком абвязваюць рукі маладых і абводзяць тройчы вакол стала, каб жыццё маладых было доўгім і багатым.
**Дзяўчынка 3**. А яшчэ хлебам-соллю на вышытым ручніку сустракаюць дарагіх гасцей.
**Бабуля**: Існаваў і такі звычай: калі нараджалася дзіця, павітуха спавівала яго ў ручнік , аздоблены выявай маці- радзіцельніцы, чым як быццам бы звязвала яго з тым месцам, дзе гэта дзіця нарадзілася.
Ручнік шырока выкарыстоўваўся і ў жалобнай абраднасці, ручнікамі абвязваюць крыжы на могілках, на ручніках раней апускалі ў магілу труну. Без ручніка не абыходзілася і ўшанаванне духаў продкаў на Дзяды.
**Дзяўчынка 1:** А я ведаю, што ў нас, на Магілёўшчыне, пасля вячэры на Дзяды на край стала клалі ручнік, кавалак мыла, ставілі кубак з вадой. На стале пакідалі вячэру. Людзі верылі, што дзяды прыйдуць на вячэру ўначы і будуць мыць рукі.Ручнік, такім чынам , паўстае перад намі як сімвалічны пасрэднік паміж светам жывым і светам нябачным.
**Бабуля:** Як бачым, сябры мае, ручнік суправаджае чалавека на працягу ўсяго яго жыцця, адлюстроўвае гісторыю народа, яго мастацкае светаўспрыманне. Але самае галоўнае, людзі верылі ў магічную аберагальную сілу ручніка: ручнік выступаў абярэгам ад хвароб, ад стыхійных з’яў прыроды, ад няшчасця. Вы, напэўна, заўважалі ручнікі і на крыжах- абярэгах каля вёсак і гарадоў.
Магічную сілу ручніку надавала вышыўка сваім колерам, узорам,сімволікай.
**Дзяўчынка 4**: Бабуля, ты падаравала нашаму школьнаму музею два ручнікі. Раскажы, калі ласка, што абазначае арнамент вышаўкі на гэтых ручніках?

**Бабуля:** Ой , мае любыя, была я калісьці, як і вы, маладая.Прыйшло да мяне каханне... Хлопец быў прыгожы, высокі, блакітнавокі. Шчаслівыя былі..., а потым ён сустрэў другую... Вось я і перадала стан сваёй душы , свае перажыванні ручніку: вышыла птушачак, якія глядзяць адзін на аднаго – гэта росквіт нашага кахання, а потым адна птушачка адыходзіць – гэта расстанне, а букет перад ёй абазначае, што ад гэтага кахання засталіся добрыя ўспаміны: не трымалі мы зла адзін на аднаго па жыцці.
**Дзяўчынка 5**: Ой, як цікава!



**Бабуля**: А вось на гэтым рушніку я адлюстравала сваё шчаслівае жыццё жанчыны-маці: васьміканцовыя зоркі, якія аплятаюць сімвал моцнай сям'і – утвараюць абярог ад няшчасцяў маёй сям"і, маіх дзетак. Вы бачыце, што на ручніку пераважае чырвоны колер – сімвал цеплыні і прыгажосці.

Падобны арнамент мы можам назіраць і на блузе жанчыны ў аздабленні рукавоў. І заўважце, дзеткі, што ў розных рэгіёнах нашай сінявокай Беларусі свая тэхніка аздаблення ручнікоў, адзення, таму вельмі справядліва сказана, што "па ручніку, што з роднай хаты" , можна пазнаць усю нашу радзіму.

**Дзяўчынка 3:** А вось мне вельмі складана разабрацца, што абазначаюць крыжыкі, ромбікі,квадраты.




**Іванка:** Дзяўчаты, гэта ж сімвалы, якія дайшлі да нас аж з язычаскіх часоў. А апісанне іх можна знайсці ў кнізе "Беларускі ручнік", аўтар Вольга Лабачэўская *(Паказвае кнігу).*

Вось глядзіце: квадрат, пастаўлены на адзін з вуглоў, – гэта сімвал сонца (1). Падобны да яго, але ўнутры змяшчае яшчэ 5 звязаных квадратаў – гэта сімвал моцнай сям"і (2), а гэта Купальскі карагод (3), патроены крыж – гэта сімвал продкаў, іх ушанаванне (4).

1. 2. 3. 4.



**Дзяўчынка 5:** Дзякуем, бабуля, дзякуем Іванка. Мы зараз добра зразумелі,чаму нашы беларускія пісьменнікі ў сваіх творах з вялікім захапленнем апісваюць наш ручнік, а кампазітары прысвячаюць песні. Паслухайце верш магілёўскага паэта Аляксея Пысіна "Ручнікі". *(Удзельнікі слухаюць верш.)*

Дзяўчынка 3:

Вышывала маці…У руках,
Як вясёлкі, ніткі мільгацелі.
Клаліся на белых ручніках
Роднай нівы фарбы і адценні.
Расцвіталі ружы і ляны
Ў непаўторных веснавых узорах.
Упляталіся напевы, сны,

Промні сонца і далёкіх зорак.
Дочкі і сыны ў жыццёвы шлях
Гэты дар – благаславення бралі;
Ў партызанскіх баравых лясах
Ручнікі на ранах абгарлі…
Крылы ільняныя … Ручнікі…
Ружы незавялыя і краскі…
Прыкладзешся вільгаццю шчакі,
Быццам матчыну адчуеш ласку.

**Унучка:** Вялікі дзякуй, дарагая бабуля, што ты ў нас такая добрая,мудрая, працавітая.

**Іванка:** Але чакайце, дзяўчаты, гэта яшчэ не ўсё, мы з бабуляй падрыхтавалі для вас заданні з сакрэтам. А спачатку пачастуйцеся цукеркамі. *(Выбіраюць цукеркі*). А цяпер знайдзіце ў пакоі кветку суадносна колеру вашай цукеркі. Кветка ўмяшчае сакрэт-пытанне. *(У цэнтры кветкі знаходзіцца QR-код з пытаннем. Удзельнікі знаходзяць свае QR-коды і адказваюць на пытанні. Дадатак 1).*

**Бабуля**: А ты, унучанька, не забылася пра тое заданне, якое я табе дасылала?

**Алёнка:** Не, бабулечка, не забылася. Я даведалася, што пры вышыванні абрадавых ручнікоў прытрымліваліся пэўных правілаў стварэння арнаменту суадносна лічбе 7. Доўжыня ручніка павінна складаць яго шырыну, памножаную на 7. Калі арнамент буйны, то ён павінен уключаць 7 элементаў.



**Бабуля:** Малайчына, Аленка. Дзякую і вам, мае дзеткі, што не забываеце сваё мінулае, цікавіцеся культурай сваіх продкаў. А з фотаздымкаў, якія ты мне, Аленка, даслала на тым тыдні, я даведалася, што вы выкарыстоўваеце беларускі ручнік у якасці нагляднасці пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў, на ўроках, у час правядзення каляндарна - абрадавых святаў , што мяне вельмі радуе.

А гэты ручнік – яшчэ адзін падарунак у ваш музей. Будзьце ж такімі прыгожымі і чыстымі, як гэтыя красачкі на ручніку.

**Дзяўчаты:** Дзякуем за шчодры падарунак. (*Дзяўчаты кланяюцца.*) Да пабачэння.

**Бабуля:** Да пабачэння, мае даражэнькія. Не абыходзьце майго парога, калі будзе ісці тут ваша дарога.

Дадатак 1.

Пытанні, якія змешчаны на QR-кодах:

1. *Які ўзор адпавядае сімвалам жыцця і вечнасці?*
2. *Сівалам чаго з'яўляецца чырвоны колер на ручніках?*
3. *Назавіце сімвал сонца на беларускім ручніку*
4. *Як называюць ручнік без аздаблення арнаментам?*
5. *Якому ручніку ў хаце надавалася найбольшая значнасць?*

| | |
|---|---|
| 1. | 2. |
| 3. | 4. |
| 5. | |

Дадатак 2.

Пытанне, адказ на якое рыхтавала Аленка: *Якога правіла прытрымліваліся пры стварэнні арнамету абрадавых ручнікоў?*